№17 кастрычнік 2011

Настаўнік. info

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

Каб не ператварыцца ў педагагічнага парабка

Павел Сапелка, юрыст

Вядома, працы настаўніка («педагагічнага работніка», паводле азначэння новага Кодэкса аб адукацыі) не пазайздросціш.

Як большасць шараговых супрацоўнікаў бюджэтнай сферы, настаўнік не распешчаны матэрыяльна, не аблашчаны ўладай, не заўсёды адэкватна ацэнены бацькамі і вучнямі.

Не буду падрабязна аналізаваць прычыны і ўмовы, якія прывялі школу да цяперашняга стану, спынюся толькі на тых, што грунтуюцца на прававым рэгуляванні адукацыйнай сферы.

1. Якімі законамі рэгулюецца час працы і адпачынку педагагічных работнікаў

На першым этапе праанализуем асноўныя прававыя нормы, якія рэгламентуюць час працы і адпачынку педагагічных работнікаў. Здаецца, працей няма куды: разгортвай Працоўны кодэкс ды карыстайся яго нядрэнна дэклараванымі і прапрацаванымі нормамі. Аднак, артыкул 319 ПК «Асаблівасці рэгулявання працы некаторых катэгорый работнікаў» стрымана выпраўляе працягваць пошукі: *“Асаблівасці рэгулявання працы творчых, педагагічных, навуковых работнікаў (конкурснае замяшчэнне пасадаў, пагадзінная аплата працы ды інш.) усталёўваюцца заканадаўствам”*. Гэта значыць, з агульных правілаў, усталяваных ПК, існуюць выключэнні, і правілы гэтых выключэнняў вызначаюць у межах сваёй кампетэнцыі зацікаўленыя ведамствы.

Нажаль, ведамасная нарматворчасць, нягледзячы на ілюзію прагрэсіўнага зместу, а то і на прагрэсіўны змест, не заўсёды ёсць юрыдычна спраўджанай ды ўзгодненай паміж суб’ектамі.



На маю думку, у гэтым і палягае прычына большасці практычных праблем з выкарыстаннем, напрыклад, працоўнага часу.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2003 № 1134 (рэдакцыя ад 08.07.2010) «Аб усталяванні скарочанай працягласці рабочага часу асобным катэгорыям педагагічных работнікаў» прызначае скарочаную працягласць працоўнага часу настаўнікам агульнаадукацыйных школ не больш за 36 гадзін у тыдзень і норму гадзін выкладчыцкай працы на стаўку 18 гадзін у тыдзень.

Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.11.2004 № 70 (рэдакцыя ад 07.10.2008) зацверджана Інструкцыя аб парадку вызначэння аплатных гадзін арганізацыйна-выхаваўчай працы і дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці навучэнцаў у агульнаадукацыйных установах, дапаможных школах (школах-інтэрнатах), установах, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Арганізацыйна-выхаваўчая праца ў навучальных установах ажыццяўляецца за межамі часу, адведзенага на правядзенне вучэбных заняткаў згодна з вучэбнымі планамі, і

У краіне

Навіны адукацыі

Праз 14 гадоў педагогам далі больш грошай на літаратуру

Педагагічным працаўнікам Беларусі павялічылі памер штомесячнай кампенсацыі на набыццё навучальнай і метадычнай літаратуры: з Br 7500 да Br 22650. Як той казаў, не прайшло і чатырнадцаці гадоў. Кампенсацыя будзе выплачвацца незалежна ад знаходжання педагога ў працоўным адпадчынку, адпачынку па цяжарнасці і родах, адпачынку па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, незалежна ад адсутнасці на працы з прычыны часовай непрацаздольнасці. Захоўваецца выплата кампенсацыі і на час павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі, а таксама стажыроўкі.

На Віцебшчыне дзяцей вучаць нацыянальнай самасвядомасці ды экалогіі

Навучальныя ўстановы Віцебскай вобласці рэалізоўваюць амаль 70 інавацыйных праектаў. Доўгатэрміновыя праекты «Этншкола» і «Этнасадок» грунтуюцца на вывучэнні гісторыі Беларусі, біяграфіі нацыянальных герояў, а таксама на дэталёвым вывучэнні рамёстваў і традыцыяў канкрэтнага рэгіёна. Экалагічная адукацыя развіваецца ў Мёрскім, Сенненскім і Віцебскім раёнах. У тамтэйшых школах надаюць павышаную ўвагу культуры энерга- і рэсурсаашчаджэння.

У настаўнікі будуць адбіраць паводле медычных паказчыкаў

Неўзабаве прадстаўнікоў маўленчых прафесій (настаўнікі, спевакі, дыктары, журналісты) будуць правяраць на галасавую прафесійную прыдатнасць. Даследаванні, праведзеныя спецыялістамі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра отарыналарынгалогіі, паказалі, што 70-80 адсоткаў людзей, чыя праца звязаная з неабходнасцю ўвесь час выкарыстоўваць голас, пакутуюць ад яго дэфектаў. Супрацоўнікі цэнтра распрацавалі базу, каб на падставе запісу голасу чалавека можна было паставіць дыягназ і здзейсніць неабходную дапамогу. Тэхналогія будзе выкарыстоўвацца ў тым ліку для адбору людзей, якія хочуць працаваць у маўленчых прафесіях.

ТЭМА НУМАРУ: ПРАВАВОЕ РЭГУЛЯВАННЕ АДУКАЦЫЙНАЙ СФЕРЫ >>> СТАР. 1-3

Н.ІЛЬІНІЧ: АДСТОЙВАЦЬ СВАЕ ПРАВЫ Ў СЁННЯШНІХ УМОВАХ! >>> СТАР. 4

Каб не ператварыцца ў

ўключае наступныя віды працы:

- класнае кіраўніцтва ці праца куратара навучальнай групы, індывідуальная і групавая выхаваўчая праца з навучэнцамі, ідэалагічная, культурна-масавая праца, арганізацыя мерапрыемстваў выхаваўча-аздараўленчага напрамку, прапаганда і фармаванне навыкаў здаровага ладу жыцця, арганізацыя грамадска-карыснай дзейнасці, працоўнае выхаванне і прафарыентацыя, прафілактыка супрацьпраўных паводзінаў навучэнцаў, сацыяльна-педагагічная праца з бацькамі;

- арганізацыя і выкананне працы па забеспячэнні навучальнага працэсу ў навучальных кабінетах, майстэрнях, лабараторыях, цыклавых, прадметных і метадычных камісіях навучальных устаноў.

Для выканання арганізацыйна-выхаваўчай працы ў навучальным годзе прызначаецца ў сярэднім 5 гадзін у тыдзень на адзін клас у агульнаадукацыйных установах.

Дадатковы кантроль навучальнай дзейнасці вучняў (далей – дадатковы кантроль) – гэта правядзенне настаўнікамі працы па праверцы ведаў навучэнцаў з ужываннем дыферэнцыяваных і індывідуальных формаў, уключна з праверкай пісьмовых работ, і выкарыстаннем сучасных тэхналогій.

Дадатковы кантроль здзяйсняецца па асобных вучэбных прадметах, дысцыплінах (акрамя вучэбных прадметаў (дысцыплін): «Выяўленчае мастацтва», «Музыка», «Працоўнае навучанне», «Фізічная культура і здароўе», «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка», факультатыўных заняткаў вайскова-патрыятычнай, музычнай, харэаграфічнай, мастацкай, тэатральнай, спартыўнай скіраванасці), за межамі часу, які адводзіцца на правядзенне вучэбных заняткаў згодна з вучэбнымі планамі.

Кожнаму настаўніку ў залежнасці ад выкладаных ім вучэбных прадметаў прызначаецца не менш за 0,5 і не больш за 2 аплатныя гадзіны ў тыдзень з разліку на стаўку, зыходзячы з усталяванай нормы гадзін выкладчыцкай працы (18 гадзін у тыдзень).

Пад педагагічнай нагрузкай пры злічэнні стаўкі педагагічным работнікам разумеецца аб'ём працы педагагічных работнікаў, які вызначаецца ў астранамічных гадзінах (у тыдзень, у год) на падставе вучэбных планаў, вучэбных праграм, планаў арганізацыйна-выхаваўчай, гуртковай, карэкцыйнай працы і ўключае выкладчыцкую, арганізацыйна-выхаваўчую працу і ажыццяўленне дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці навучэнцаў (Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.03. 2007 № 25 «Аб некаторых асаблівасцях рэгулявання працы педагагічных работнікаў», разам з «Інструкцыяй па методыцы злічэння ставак педагагічных работнікаў з улікам педагагічнай нагрузкі»).

Такім чынам, стаўка з улікам педагагічнай нагрузкі настаўніка складзе тарыфную стаўку, памножаную на суаднясенне гадзін педагагічнай нагрузкі да ўсталяванай нормы гадзін выкладчыцкай працы (18 гадзін).

Астатнія выплаты носяць характар даплат і прэмій.

2. Ці можна прыцягваць настаўніка на працягу працоўнага дня да працаў, не пазначаных у яго кантракце і не прадугледжаных заканадаўчымі актамі?

Для чаго я так падрабязна спыніўся на вызначэнні нагрузак і вылічэнні ставак? Бо гэтыя нормы вызначаюць межы аплатнай працы настаўніка. Заканадаўчае рэгуляванне выкарыстання астатняга часу (з 36 гадзін у тыдзень) надзвычай размытае. Будзе дарэчы выказаць здагадку, што гэты час павінен выкарыстоўвацца для забеспячэння педагагічнай дзейнасці. Дарэчы, у Расіі вялікая частка пытанняў аб працы педагагічных работнікаў урэгулявана ў загадзе Міністэрства адукацыі і навукі РФ «Об особенностях режима рабочего времени и времени отдыха педагогических и других работников образовательных учреждений». Так, *"при составлении расписаний учебных занятий образовательное учреждение обязано исключить нерациональные затраты времени педагогических работников, ведущих преподавательскую работу, с тем, чтобы не нарушалась их непрерывная последовательность и не образовывались длительные перерывы (так называемые «окна»), которые в отличие от коротких перерывов (перемен) между каждым учебным занятием, установленных для обучающихся, воспитанников, рабочим временем педагогических работников не являются"*.

Тады ці можна прыцягваць настаўніка на працягу працоўнага дня да працаў, не пазначаных у яго кантракце і не прадугледжаных заканадаўчымі актамі? Вядома, не. Дзеянне Працоўнага кодэкса і адпаведных яму актаў, якія вызначаюць правы і абавязкі работнікаў, пашыраецца і на педагогаў-настаўнікаў.

3. Якія законы і заканадаўчыя акты рэгулююць прававы стан настаўніка?

Тут будзе дарэчы зрабіць выснову, якую ролю павінен граць Працоўны кодэкс у вызначэнні прававога стану настаўніка. Згодна з арт. 7 ПК, крыніцамі рэгулявання працоўных і звязаных з імі дачыненняў з'яўляюцца:

1) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь;

2) Працоўны кодэкс ды іншыя акты заканадаўства аб працы;

3) Калектыўныя дамовы, пагадненні ды іншыя лакальныя нарматыўныя прававыя акты, заключаныя і прынятыя згодна з заканадаўствам;

4) працоўныя дамовы.

Лакальныя нарматыўныя прававыя акты, у якіх акрэслены ўмовы, што пагаршаюць стан работнікаў у параўнанні з заканадаўствам аб працы, з'яўляюцца несапраўднымі.

Наймальнік мае права прызначаць дадатковыя працоўныя ды іншыя гарантыі для работнікаў у параўнанні з заканадаўствам аб працы.

У выпадку супярэчнасці паміж нормамі заканадаўства аб працы роўнай юрыдычнай сілы прымяняецца норма, якая змяшчае больш ільготныя ўмовы для работнікаў.

Акрамя таго, Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства аб працы.

Нормы дзейных міжнародных дамоваў Рэспублікі Беларусь або канвенцый Міжнароднай арганізацыі працы, удзельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, з'яўляюцца часткай дзейнага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь заканадаўства аб працы, падлягаюць непасрэднаму прымяненню, акрамя выпадкаў, калі з міжнароднай дамовы або канвенцыі вынікае, што для прымянення такіх нормаў неабходна выданне ўнутрыдзяржаўнага акта (арт. 8 ПК).

Наймальнік не мае права патрабаваць ад работніка выканання працы, не абумоўленай працоўнай дамовай, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі. Дарэчы, заканадаўчыя акты: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, законы Рэспублікі Беларусь, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (арт. 1, Закон Рэспублікі Беларусь ад 10.01.2000 №361-З «Аб нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь»). Лакальныя нарматыўныя акты кшталту службовых інструкцый, іншых актаў ведамаснай нарматворчасці заканадаўчымі не з'яўляюцца.

А заканадаўчыя акты практычна ніколі не паказваюць на настаўніка, як на абавязанага суб'екта.

педагагічнага парабка

Напрыклад, Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24.11.2006 № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у недабрабытных сем’ях» ускладае на работнікаў устаноў адукацыі абавязак паведаміць пра вядомыя ім факты аб неналежным выкананні бацькамі абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей. Але ніякім чынам нельга патлумачыць, што гэтая норма забавязвае педагога «хадзіць гатаваць суп» у праблемныя сем’і.

Як я ўжо згадаў, цытуючы ПК, правы ды абавязкі бакоў працоўнай дамовы могуць прызначацца і вызначацца калектыўнай дамовай (пагадненнем). Гэтыя дамовы могуць прадугледжваць іншыя правілы, чым закон. Дыскрымінацыйныя ўмовы калектыўных дамоваў, пагадненняў з’яўляюцца несапраўднымі, а тыя, што скіраваны на карысць работніка, могуць і павінны працаваць.

Так, нярэдка калектыўныя дамовы прадугледжваюць абавязак наймальніка працягнуць (заключыць новы) контракт па сканчэнні тэрміну яго дзеяння, калі работнік, напрыклад, не парушаў працоўнай дысцыпліны; могуць таксама прадугледжваць дадатковыя падставы скасавання працоўнай дамовы, дадатковыя выплаты і гарантыі.

Пры прыёме на працу наймальнік абавязаны пазнаёміць работніка з калектыўнай дамовай.

Паводле іншых, акрамя прадугледжаных калектыўнай дамовай, падставаў, вылучаць патрабаванні аб працягу (заключэнні новага) контракта, заключэнні контракта на акрэслены тэрмін могуць толькі асобныя катэгорыі работнікаў: працуючыя жанчыны, якія знаходзяцца ў адпачынку па цяжарнасці і родах, маці (бацькі дзіцяці замест маці, апекуны), якія знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту трох гадоў, работнікі перадпенсійнага ўзросту, цяжарныя жанчыны (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12.04.2000 № 180 «Аб парадку прымянення Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 г. №29»).

Важнае новаўвядзенне заканадаўства: наймальнік з пісьмовай згоды работніка, які не меў парушэнняў працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны, прапрацаваў у гэтага наймальніка не менш за пяць гадоў, пасля сканчэння тэрміну дзеяння контракта мае права заключыць з работнікам працоўную дамову на неакрэслены тэрмін.

Пры адмове работніка ад заключэння працоўнай дамовы на неакрэслены тэрмін паводле пісьмовай згоды паміж бакамі контракт можа быць працягнуты або заключаны новы контракт.

Пра намер працягнуць працоўныя дачыненні на ўмовах працоўнай дамовы на неакрэслены тэрмін наймальнік пісьмова папярэджвае работніка не пазней чым за адзін месяц да сканчэння тэрміну дзеяння контракта (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 31.03.2010 № 164 «Аб унясенні змяненняў і дадаткаў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2000 г. № 180»).

Аднак, як бачна з прыведзенага тэксту, абавязак заключыць працоўную дамову на неакрэслены тэрмін на наймальніка названым актам не ўскладаецца.

Работнікі, сярод іншых правоў, паказаных у ПК, маюць права на:

- гарантаваную справядлівую долю ўзнагароды за працу згодна з яе колькасцю, якасцю і грамадскім значэннем, але не ніжэй за ўзровень, які дае работнікам і іх сем’ям свабоднае і годнае існаванне;

- штодзённы і штотыднёвы адпачынак, у тым ліку выхадныя дні падчас дзяржаўных святаў і святочных дзён, і адпачынак працягласцю не ніжэй за вызначаны ПК;

- неўмяшальніцтва ў прыватнае жыццё і павагу асабістай годнасці;

- судовую і іншую абарону працоўных правоў.

4. Куды звяртацца, калі парушаюцца вашыя правы

Сродкі судовай «ды іншай» – пракурорскай, Камітэта дзяржкантролю, прафсаюзнай – абароны я прапаную выкарыстоўваць у максімальнай ступені. Прадбачу пярэчанні і скептычнае стаўленне да гэтай прапановы, але скажу: без зачатку і канца не было б. Вядома, лягчэй абгрунтаваць бяздзейнасць, чым прапанаваць план дзеянняў. Пісьменна абгрунтаваная, аргументаваная скарга ў кампетэнтны орган – гэта магутны сродак. Вядома, тактычна больш слушна, калі з ёй звернецца той, хто не баіцца патрапіць пад прэсінг; а такіх стала нямала, мяркуючы з выказванняў настаўнікаў пра каштоўнасць прафесіі...

Дарэчы, калі скарга даслана ў кампетэнтны орган, у ёй выказваюцца крытычныя заўвагі, скіраваныя на скасаванне парушэнняў, заяўнік не можа пераследвацца ў парадку абароны гонару і годнасці (дзе абавязак давесці сапраўднасць паведамленых звестак ляжыць на асобе, што разгаласіла звесткі, якія ганяць гонар і годнасць), калі заяўнік не злоўжывае сваім правам.

Інакш так і будзе небагаты настаўнік замест набыцця метадычных дапаможнікаў на 22 650 рублёў у месяц (што само па сабе смешыць) зачытвацца «Юным спасателем», мыць падлогі ў калідорах, ляпіць самаробкі замест адсутных талентаў, рэгулярна «падвышаць» паспяховасць на фоне дэградацыі вучняў.

Чакаць, што дзяржава са сваёй ініцыятывы павернецца тварам, не мае сэнсу.

Бярэ моц Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Ці дужа ён зменіць становішча ў школе? Сумняюся: як і раней, нормы, якія рэгулююць прававы стан удзельнікаў адукацыйнага працэсу, збольшага дэкларатыўныя.

Так, настаўніку далі ў рукі сродак супраць нядбалых вучняў – увялі дысцыплінарную адказнасць навучэнцаў агульнаадукацыйных школ. З 1 верасня 2011 г. стане магчымым пазбавіцца ад нядбалага «обучающегося» (тэрміналогія Кодэкса), калі той завяршыў засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі і дасягнуў 16-годдзя, за сістэматычнае (паўторнае на працягу навучальнага года) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў навучэнца альбо за працяглы прагул. Пытанне ў тым, ці гатовая школа распачаць удзел у сотнях, а то і тысячах судовых працэсаў па абскарджанні ўжытай меры дысцыплінарнага спагнання. А што рабіць з тымі, каго суд пасля трох-чатырох месяцаў судовага разбору і, адпаведна, адсутнасці адновіць у навучальнай установе? На каго залічаць працэсуальныя выдаткі? Ці гатовыя настаўнікі сустрэцца ў судах з адвакатамі, якія будуць прадстаўляць непаўналетніх, або, як мінімум, рыхтаваць для іх дакументы (дарэчы, бясплатна), калі вучань або яго законны прадстаўнік у парадку, прадугледжаным Кодэксам, абскарджвае накладанне спагнання?

Вядома, сам-насам здужаць гадамі дасканаленую сістэму заняволення настаўнікаў няпроста, амаль немагчыма. Таму неабходна ствараць грамадскія аб’яднанні, незалежны прафесійны саюз педагагічных работнікаў, у рамках дзейнасці якіх, з прыцягненнем кваліфікаваных юрыстаў, адстойваць свае правы. Дастаткова на прыкладзе некалькіх справаў пераламіць сітуацыю, каб знармалізаваць становішча педагога прынамсі ў той ступені, што дазваляе эканамічны і палітычны стан дзяржавы. На першым этапе зарганізавацца могуць тыя з педагогаў, хто паводле сямейнага і матэрыяльнага стану, стажу працы ды інш. менш залежыць ад адміністрацыі.

Пераклад з рускай паводле: http://www.nastaunik.info/news/?id=5793

Адстойваць свае правы ў сённяшніх умовах!

Наталля Ільініч, настаўніца

Вымова і скарачэнне тэрміну дзеяння контракта

Восенню 2009 г. Пухавіцкі райвыканкам прыняў рашэнне аб ліквідацыі Талькаўскага сельсавета, далучэнні яго да Блужскага. Ініцыятыўная група мястэчкоўцаў напісала зварот у райсавет, аблсавет і газету «Звязда» з пратэстам супраць ліквідацыі Талькаўскага сельсавета. Сярод 5 падпісантаў звароту было і маё прозвішча.

> Праз некалькі дзён дырэктарку школы выклікала намесніца старшыні райвыканкама па ідэалогіі і загадала ёй не падпісваць кантракт з настаўніцай Ільініч.

Папярэдні кантракт быў на 5 год, за 24 гады працы ў школе ў мяне не было ніводнай вымовы. Наадварот: была грамата аблвыканкама, стос дыпломаў, граматаў за перамогі маіх вучняў у розных конкурсах, у тым ліку агульнабеларускіх.

Як не падпісаць кантракт з гэтай настаўніцай? — спытала дырэктарка. Яна разумела, што сапраўднай прычынай гневу начальніцы былі подпіс пад зваротам з крытыкай мясцовых уладаў ды заява пра адкліканне дэпутатаў.

Дырэктарка прымае «саламонава» рашэнне: дае мне вымову "за выкарыстанне школьнага краязнаўчага сайта ў асабістых карыслівых мэтах" (першая вымова за 24 гады маёй працы ў Талькаўскай школе) і, матывуючыся гэтай вымовай, як вялікую ласку, падпісвае 11 студзеня 2010 г. са мной кантракт на 1 год. Згодна з калектыўнай дамовай Талькаўскай школы, дырэктар абавязаны падпісаць з паспяховым працаўніком, які добрасумленна выконвае свае абавязкі, кантракт на 3 ці 5 гадоў, не менш.

Вымова была несправядлівая і абсурдная. Яе трэба было абскардзіць у судзе, але я гэтага не зрабіла. Чаму? Бо не ведала, што гэта вельмі важна. Я даведалася пра гэта пазней, калі праз год мяне звольнілі, не працягнуўшы кантракт. Пры гэтым адміністрацыя (і суд прыняў такое абгрунтаванне) спасылалася на тую вымову. Маўляў, кантракт быў падпісаны на 1 год, бо была вымова. Мае тлумачэнні потым, што вымова была несправядлівая, злепленая спецыяльна, каб выканаць загад раённай начальніцы, разбіліся аб пытаннне: а чаму ж яе адразу не аспрэчылі?

> Адвакат мне патлумачыў, што ўжо сам факт аспрэчвання несправядлівых спагнанняў вельмі важны для будучых крокаў па адстойванні сваіх правоў. А раз ты не аспрэчыў несправядлівую вымову, значыць ты з ёй пагадзіўся, значыць, у адміністрацыі будзе падстава потым не заключыць з табой працоўны кантракт.

Робячы высновы з гэтых падзей, раю ўсім калегам, хто адстойвае свае правы, заўсёды абскарджваць спагнанні, вымовы, якія вам далі несправядліва.

Таксама надзвычай істотна ўважліва вывучыць умовы вашай калектыўнай дамовы.

Калі б я раней ведала, што у нашай дамове ёсць палажэнне, што дырэктар абавязаны падпісаць з паспяховым працаўніком, які не мае спагнанняў, дамову не менш чым на 3 ці 5 гадоў, я б, вядома, аспрэчыла тое несправядлівае спагнанне!

Выклік у абласное ўпраўленне адукацыі: "Настаўнік школы не можа быць сябрам апазіцыйнай партыі"

11 студзеня 2010 г. дырэктарка падпісала са мной кантракт, а 15 студзеня мяне раптоўна выклікалі ў Мінскае абласное ўпраўленне адукацыі на прыём да начальніцы Таісы Іванаўны Данілевіч.

У прыёмную мы з'явіліся з выканальніцай абавязкаў начальніка Пухавіцкага РАА Аленай Шастаковай. Там ужо было чалавек дзесяць незнаёмых людзей (як высветлілася, шэсць настаўнікаў з розных раёнаў Мінскай вобласці і начальнікі РАА гэтых раёнаў). Нас выклікалі па двое: настаўнік — і начальнік адпаведнага РАА. Мяне паклікалі апошняй, таму хоцькі-няхоцькі давялося выслухаць гутаркі Данілевіч з кожным настаўнікам. Гэта былі крыкі, папрокі і пагрозы, якія добра чуліся нават праз падвойныя дзверы. Асабліва ўгнявіла начальніцу маладая настаўніца з Любанскага раёна: акрамя таго, што была ў Аб'яднанай грамадзянскай партыі, яна яшчэ і надумалася вылучацца ў дэпутаты мясцовага савета! На думку кіраўніцы, гэта было страшэннае злачынства, несумяшчальнае з прафесіяй настаўніка. "Я покажу тебе депутатство! Будешь пешком бежать в своё Уречье и про окончание аспирантуры можешь забыть!"

Калі мы зайшлі ў кабінет з Аленай Шастаковай, там, акрамя Данілевіч, былі яшчэ 3 асобы, напэўна, яе намеснікі. Мне Таіса Іванаўна прад'явіла шэраг правінаў: сяброўства ў партыі БНФ — "учителя столичной области не могут быть членами оппозиционных партий"; правядзенне Талькаўскага фэсту — "праздник, на который приезжают известные оппозиционные деятели"; напісанне звароту супраць ліквідацыі Талькаўскага сельсавета — "писать вы умеете".

> Данілевіч ва ўльтыматыўнай форме загадала мне выйсці з партыі БНФ ці напісаць заяву на звальненне з працы. На гэта быў прызначаны тэрмін — 3 дні.

Дакумент аб выхадзе з партыі (пратакол сходу партыйнай арганізацыі) было даручана Шастаковай даставіць Данілевіч не пазней, чым праз пяць дзён.

Агаломшаная, я выйшла з высокай установы. Што рабіць? Страціць працу ў вёсцы, дзе немагчыма знайсці нічога па маёй спецыяльнасці? Выйсці з партыі з-за незаконнага патрабавання начальніцы, страціўшы годнасць і самапавагу? Я вырашыла напісаць скаргу ў пракуратуру: выклала апісанне гэтай падзеі і дадала просьбу даць прававую ацэнку таму, што адбылося ў кабінеце начальніка АУА. Я лічыла, што была парушана Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (арт. 4, 5, 33, 36: "Грамадзяне роўныя перад законам, маюць права на свабоду аб'яднанняў"), Працоўны кодэкс (арт. 14: "Дыскрымінацыя, г. зн. абмежаванне ў працоўных правах у залежнасці ад … палітычных поглядаў, удзелу ці няўдзелу ў прафсаюзах ці іншых грамадскіх аб'яднаннях, … забараняецца"), закон «Аб палітычных партыях» (арт. 3: "Прыналежнасць або непрыналежнасць грамадзяніна не могуць служыць падставай для абмежавання яговых правоў і свабодаў"). Адначасова да Мінскага абласнога пракурора звярнуўся са сваёй скаргай калега з Нясвіжа Алесь Язвінскі.

> Пракуратура знайшла неабходным "патлумачыць Данілевіч Т. І. канстытуцыйныя і працоўныя правы грамадзян, у тым ліку на свабоду думкі, перакананняў, на свабоду аб'яднання ў палітычныя партыі".

Мы, настаўнікі, пастаўленыя перад дылемай «партыя або праца», захавалі тады сваю працу. Двое настаўнікаў — сяброў АГП выйшлі са сваёй партыі, астатнія, здаецца, захавалі ўсё, як было. Іх ніхто не чапае. Не чуваць, каб іншых настаўнікаў так брутальна гналі за партыйнасць. Я лічу гэта калі не перамогай, то маленькай перамогай. Хаця б над уласнай бояззю і згодніцтвам.

Настаўнік.інфо.
Інфармацыйна-метадычны бюлетэнь для настаўнікаў
Выдаецца ініцыятыўнай групай стваральнікаў сайта *Nastaunik.info*
Адрас для допісаў: *nastaunik.info@gmail.com*
Наклад *200* асобнікаў